Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суды ў сталіцы працягваюцца дапоўнена

17.03.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Леанід Кулакоў у судзе. Фота Радыё Свабода.

У судзе Першамайскага раёна Мінска 17 сакавіка ў 9-30 пачаўся разгляд адміністрацыйнай справы актывіста “Еўрапейскай Беларусі” **Леаніда Кулакова**. Яго абвінавачваюць ва ўдзеле ў мітынгу недармаедаў, які адбыўся ў Мінску 17 сакавіка. Суддзя Анастасія Папко вынесла пастанову аб пакаранні актывіста штрафам ў памеры 50 базавых велічынь па частцы 3 артыкула 23.34 КаАП.

Маю Навумаву таксама пакаралі штрафам зу памеры 20 базавых велічынь за тую ж самую акцыю 17 сакавіка. Суддзя С. Чараповіч.

У гэтым жа судзе адбудзецца разгляд справы актывісткі **Вольгі Маёравай** (11-00). Прысуд - 50 базавых велічынь па ч. 3 арт. 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве). Суддзя - Чараповіч.

Такі самы штраф (50 базавых) атрымала ад суддзі А. Папко **Вольга Нікалайчык.**

Галіна Лагацкая чамусці не пакараная штрафам, а арыштаваная на 10 сутак. Актывісты сабралі ёй ежы і гігіенічныя сродкі проста ў залі суда.

У судзе Цэнтральнага раёна Мінска ў 12-00 – разгляд адміністрацыйнай справы **Яўгена Батуры і Алекса Кліменкі,** таксама за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве.

У гэтым за судзе будуць судзіць лідэра прафсаюза РЭП **Генадзя Фядыніча.** Суддзя **Вікторыя Шабуня** вынесла пастанову - пакараць штрафам у памеры 50 базавых велічынь.

Суддзя **Вікторыя Шабуня** першай разгледзела справу **Алекса Кліменкі**. Ён не з'явіўся у судзе. Выступіў сведка намеснік начальніка Маскоўскага РУУС Сяргей Астаф'еў і ўчастковы інспектар А. Леўшуноў. Пастанова – штраф у памеры 50 базавых велічынь.

Яўгена Батуру судзяць за ўдзел у абароне тэрыторыі забудовы ў Курапатах, і яшчэ па нейкім іншым пратаколе. Сведка па справе будаўнік Хабалкін, кажа, што Батуру ніколі не бачыў, проста падпісаў запоўнены пратакол. Ён з ім нават не знаёміўся. Суддзя будзе рабіць запыт у Савецкі РАУС, каб высветліць, для чаго Жэню выклікалі туды 2 сакавіка.
"Я б не хацела, каб яшчэ адзін працэсуальны дакумент усплыў па гэтай справе", - кажа суддзя. Жэню запрашаюць падыйсці ў суд 22 сакавіка ў 14.30.
На сёння гэта ўсё.

У судзе Маскоўскага раёна горада Менска ў 11-00 пачаўся разгляд адміністрацыйнай справы грамадзянскага актывіста «Zмены» **Паўла Вінаградава**. Па інфармацыі Белсата, адміністрацыйная справа распачатая за ўдзел актывіста ў акцыі пратэсту 17 лютага. На судовае паседжанне Павел прыходзіць не збіраўся і не прыйшоў. Суддзя **Віктар Казак** выдаліўся на перапынак да абвяшчэння пастановы, якое адбудзецца а 12:30. Прысуд -- 50 базавых.

Яшчэ адзін актывіст "Еўрапейскай Беларусі" **Максім Вінярскі** паведаміў праваабаронцам, што ў Фрунзенскім судзе Мінска сёння павінны разглядацца два адміністрацыйныя пратаколы па арт. 23.34 КаАП, складзеныя на яго за ўдзел у акцыі 17 лютага. Вінярскі не збіраецца йсці на суд, таму рашэння па сваёй справе пакуль ня ведае.

Магчыма таксама, што ў судзе Партызанскага раёна разгляддаецца, альбо разгледжаная справа **Антона Жылко** па ч.3 арт.23.34 КаАП за ўдзел у абароне тэрыторыі забудовы ў Курапатах.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 920 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY